## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

# ГЕНАДЗІЙ МІХАЙЛАВІЧ ЛЫЧ

**(Да 80-годдзя з дня нараджэння)**



25 лютага 2015 г. споўнілася 80 гадоў выдатнаму беларускаму вучонаму-эканамісту, заслужанаму дзеячу навукі БССР, акадэміку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктару эканамічных навук, прафесару Генадзію Міхайлавічу Лычу.

Генадзій Міхайлавіч нарадзіўся ў вёсцы Магільнае Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і селяніна, скончыў Магільнянскую сярэднюю школу, а затым аддзяленне эканомікі сельскай гаспадаркі планава-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава (цяпер Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт).

З 1958 па 1961 г. працаваў на Брэсцкай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі. У 1961 г. паступіў у аспірантуру пры Усесаюзным НДІ гідратэхнікі і меліярацыі імя А. М. Касцякова. У паспяхова абароненай у 1961 г. кандыдацкай дысертацыі ён прымяніў якасна новы метадалагічны падыход да вызначэння эканамічнай эфектыўнасці асушальных меліярацый у зоне няўстойлівага і залішняга ўвільгатнення, што дазволіла яму істотна ўдакладніць ацэнку эканамічнай эфектыўнасці, буйнамаштабнага асушэння балот і забалочаных зямель, якія праводзіліся ў тыя гады.

Праблемам эфектыўнасці меліярацыі Генадзій Міхайлавіч прысвяціў наступныя 12 гадоў сваёй навуковай дзейнасці, працуючы пасля заканчэння аспірантуры спачатку ў Беларускім НДІ эканомікі і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці (1964−1967 гг.), а затым у Беларускім НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі (1967−1977 гг.).

У 1972 г. па выніках сваіх навуковых распрацовак ён абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Эканамічная эфектыўнасць асушальных меліярацый». У ёй вучоны яшчэ больш удакладніў метады вызначэння эканамічнай эфектыўнасці меліярацыі балот і забалочаных зямель, якія прымяняліся да яго і прыводзілі да штучнага павышэння яе абагульненых паказчыкаў. У прыватнасці, ім былі распрацаваны больш дасканалыя метадычныя прыёмы ўліку фактару часу, якія затым былі пакладзены ў аснову прапанаванай Г. М. Лычом прынцыпова новай дынамічнай мадэлі вызначэння эканамічнай эфектыўнасці капітальных укладанняў у асушэнне і сельскагаспадарчае асваенне асушаных балот і забалочаных зямель. Разам з гэтым ім былі сфармуляваны цэнныя прапановы па забеспячэнні супастаўляльнасці затрат і эфектаў шляхам больш поўнага ўліку аднаразовых і бягучых затрат, звязаных з атрыманнем эфекту ад меліярацыі і сельскагаспадарчага асваення меліяраваных зямель. Гэта дазволіла больш дакладна ацаніць вынікі меліярацыйнага ўздзеяння на землі асобных раёнаў Беларусі. Найважнейшыя вынікі навуковых даследаванняў Г. М. Лыча па гэтай народнагаспадарчай праблеме знайшлі адлюстраванне ў шэрагу манаграфій, а таксама шматлікіх артыкулах, апублікаваных у саюзных і рэспубліканскіх выданнях. Па сутнасці, ужо да сярэдзіны 1970-х гг. Генадзій Міхайлавіч стаў агульнапрызнаным аўтарытэтам у навуковым свеце СССР у галіне эканомікі асушальных меліярацый. За гэтыя заслугі ў 1977 г. яму было прысвоена навуковае званне прафесара, а у 1980 г. – заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР.

З канца 1970-х гг. кола навуковых інтарэсаў Г. М. Лыча істотна пашырылася. У цэнтры яго ўвагі знаходзіліся праблемы эканамічнай эфектыўнасці ўсёй сельскагаспадарчай вытворчасці, перш за ўсё эканамічнай эфектыўнасці капітальных укладанняў у аграрны сектар эканомікі і асноўных фондаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Вынікі гэтых распрацовак таксама знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх публікацыях, у тым ліку ў дзвюх аўтарскіх манаграфіях – «Эканамічная эфектыўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці» і «Эканамічная эфектыўнасць вытворчых рэсурсаў», адной калектыўнай манаграфіі – «Размяшчэнне і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларускай ССР».

Аналіз гэтых прац паказвае, што Генадзій Міхайлавіч нярэдка выказваў меркаванні, якія разыходзіліся з думкамі, існуючымі ў навуковым свеце, а таксама з праводзімымі на практыцы мерапрыемствамі. Так, насуперак агульнапрынятай у той час думцы аб мэтазгоднасці ўсямернага разгортвання будаўніцтва жывёлагадоўчых комплексаў прамысловага тыпу больш буйных памераў Генадзій Міхайлавіч выявіў шэраг негатыўных вынікаў рэалізацыі на практыцы такога падыходу да развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы прадукцыйнай жывёлагадоўлі. У далейшым гэта стала відавочным і для гаспадарнікаў. Прызнанне Генадзія Міхайлавіча Лыча як аднаго з вядучых эканамістаў-аграрнікаў па праблемах эканамічнай эфектыўнасці капітальных укладанняў і асноўных фондаў пацвердзілася выбраннем яго ў 1986 г. членам-карэспандэнтам АН БССР.

У сувязі з пераходам у сістэму Акадэміі навук БССР (у 1988 г. – загадчык аддзела, з 1989 г. – дырэктар Інстытута эканомікі, з 1992 па 1998 г. – адначасова акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, з 1999 г. – галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі, з 2007 г. – прафесар Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, з 2009 г. – галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі) Генадзій Міхайлавіч заняўся праблемамі мікраэканомікі, у прыватнасці, рыначных рэформ, эканамічнага суверэнітэту (суаўтар «Канцэпцыі эканамічнага суверэнітэту Беларускай ССР», «Праграмы пераходу Беларускай ССР да рыначнай эканомікі» і г. д.). У 1992 г. ён быў абраны акадэмікам Акадэміі навук БССР. Пэўным вынікам даследаванняў Г. М. Лыча па пытаннях пераходу нашай краіны да рыначнай эканомікі з'яўляецца манаграфія «Рыначнае рэфармаванне эканомікі Беларусі: вынікі і перспектывы», апублікаваная ў 2000 г.

У 1990-я гг. Генадзій Міхайлавіч прымае актыўны ўдзел у правядзенні шырокамаштабных навуковых даследаванняў, якія прадугледжвалі распрацоўку сістэмы навукова абгрунтаваных мерапрыемстваў па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Пад яго навуковым кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле былі распрацаваны метады вызначэння, аналізу і ацэнкі сацыяльна-эканамічных страт, якія прычыняюцца народнай гаспадарцы краіны буйнымі тэхнагеннымі аварыямі, а таксама здзейснены гэтыя разлікі. Дарэчы, падобная работа не была праведзена ні ў Расіі, ні ва Украіне. Вынікі даследаванняў па Чарнобыльскай праблеме адлюстраваны ў дзвюх манаграфіях (у суаўтарстве з З. Р. Пацеевай) – «Чарнобыльская катастрофа: сацыяльна-эканамічныя праблемы і шляхі іх вырашэнняў» і «Эканамічная навука – рэабілітацыі раёнаў радыеактыўнага забруджання». Адначасова шмат увагі ён надае і іншым сацыяльна-эканамічным аспектам праблемы экалогіі, у тым ліку эканамічнай бяспецы і экалагізацыі эканомікі. У 2002 г. ім апублікавана манаграфія «Экалагічная бяспека: сацыяльна-эканамічныя аспекты» (у суаўтарстве з З. Р. Пацеевай і інш.) і ў 2004 г. – вучэбна-метадычны дапаможнік «Сацыяльна-эканамічныя аспекты экалагізацыі вытворчасці».

Разам з навуковымі даследаваннямі Генадзій Міхайлавіч актыўна займаецца публіцыстыкай. Ім напісаны шэраг навукова-папулярных кніг, прысвечаных актуальным пытанням грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і нацыянальна-культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

З пачатку 2000-х гг. акадэмік Г. М. Лыч вялікую ўвагу ў сваёй навуковай працы надае даследаванню праблем эфектыўнасці знешнегандлёвай дзейнасці і інавацыйнага развіцця нацыянальнай эканомікі. Абедзве гэтыя праблемы ў цяперашні час набылі асаблівую актуальнасць. Першая з іх – у сувязі з жыццёвай неабходнасцю хутчэйшага пераадолення адмоўнага сальда знешняга гандлю, а другая – пераходу нацыянальнай эканомікі на інавацыйны шлях развіцця. Па абедзвюх названых праблемах Г. М. Лычом апублікаваны шэраг артыкулаў. Асноўная ўвага ў іх надаецца такім пытанням, як метадалагічныя падыходы да вызначэння эканамічнай эфектыўнасці экспартна-

імпартных аперацый, павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі, у тым ліку яе аграпрамысловага комплексу, на сусветным рынку з дапамогай больш эфектыўнай адаптацыі да глабалізацыі светагаспадарчых сувязей і падключэння да глабальных вытворча-збытавых і інавацыйных сетак, а таксама абгрунтаванне важнейшых прыкмет інавацыйнай эканомікі і ацэнка на інавацыйнасць нацыянальна-гаспадарчага комплексу, вызначэнне ролі дзяржавы, канкурэнтнага рынку і грамадзянскай супольнасці ў інавацыйным развіцці краіны, абгрунтаванне неабходнасці іх актыўнага ўзаемадзеяння з мэтай паскарэння пераводу беларускай эканомікі на інавацыйныя рэйкі.

У апошнія гады навуковая дзейнасць Генадзія Міхайлавіча зноў сканцэнтравана на даследаванні праблем і перспектыў развіцця айчыннага аграпрамысловага комплексу. У прыватнасці, ім вядуцца даследаванні дзейснай сістэмы кіравання сельскагаспадарчымі арганізацыямі, распрацоўваюцца механізмы забеспячэння канкурэнтаздольнасці АПК, яго інтэграцыі ў Еўразійскую эканамічную прастору. Перспектывы развіцця аграпрамысловага комплексу Беларусі разглядаюцца ў апублікаванай у 2014 г. манаграфіі «Развитие агропромышленного комплекса: новые вызовы и возможные ответы на них» (у суаўтарстве з А. П. Шпакам).

Усяго акадэмікам Г. М. Лычом апублікавана больш за 300 навуковых прац, у тым ліку 17 манаграфій (да асноўных з якіх, разам з названымі раней, таксама адносяцца «Комплексная мелиорация земель в Белорусском Полесье» (1982) і «Экономика Беларуси: пути стабилизации и социально-экономического обновления» (1995)).

Акрамя таго, на працягу ўсёй сваёй навуковай дзейнасці Генадзій Міхайлавіч Лыч удзельнічаў у падрыхтоўцы навуковых кадраў Рэспублікі Беларусь. Ім падрыхтавана 15 кандыдатаў і 2 дактары эканамічных навук.

Ад усёй душы шчыра віншуем юбіляра, Генадзія Міхайлавіча Лыча, з 80-годдзем і жадаем здароўя, доўгіх гадоў жыцця, новых навуковых дасягненняў, творчых поспехаў і дабрабыту.

*Калектыў супрацоўнікаў Інстытута эканомікі НАН Беларусі*